# ІМІДЖ З НАДЗЕЯЙ НА БУДУЧЫНЮ

## Гродзенка шые галаўныя ўборы для жанчын з анкалогіяй і гатова далучыцца да праекта па кансультацыі хворых

**Ідэя з пашывам галаўных убораў з'явілася пасля таго, як Валянціна КАЗУКЕВІЧ пяць гадоў таму сутыкнулася з анказахворваннем. Пасля хіміятэрапіі паўстала пытанне: а што насіць? Першае, што ў такіх выпадках прыходзіць на думку, купіць парык. Але ацаніўшы плюсы і мінусы, Валянціна адмовілася ад гэтага. І вырашыла пашыць галаўны ўбор на свой густ. Паступова гэтая справа стала яе асноўным відам дзейнасці і дапамагае ствараць новы імідж пацярпелым ад хваробы жанчынам.**



Пра Валянціну даведалася ў гродзенскім цэнтры рамёстваў «Спадчына», калі там ішла дэманстрацыя яе галаўных убораў. Тэма, вядома, даволі далікатная. Таму не ведала, як Валянціна адрэагуе на прапанову напісаць аб яе занятку артыкул у «Звязду». І сапраўды, не адразу атрымала згоду, але праз некаторы час жанчына перадаміла, што такая публікацыя нават патрэбная. Магчыма, яна дапаможа камусьці не адчайвацца, захаваць жаноцкасць і быць прыгожай, нягледзячы ні на што. Такі дэвіз, між іншым, і ў самой Валянціны.

Прызнацца, перад сустрэчай было хваляванне ад таго, наколькі шчырая будзе наша размова. Але ўбачыўшы ветлівую, прыгожую жанчыну, гэтая боязь развеялася. Валянціна не стала хаваць пачуццяў, расказала аб тым, як асабіста прайшла складаны перыяд у жыцці.

З цяжкай хваробай яна сутыкнулася ў 38 гадоў. Вядома, пачуць такі прысуд яшчэ маладой жанчыне вельмі балюча. «Гэта было як удар маланкі», — апісала той стан суразмоўніца.

Да ўрача яна пайшла, калі знайшла ў сябе зацвярдзеласць. Урач на аснове ўльтрагукавой дыягностыкі пацвердзіў яе найгоршыя падазрэнні. Былі праведзены аперацыя і курс хіміятэрапіі. Пасля таго і паўстала праблема галаўнога ўбора.

— На самай справе гэта вельмі важны аспект. Вядома, пачуць страшны дыягназ само па сабе балюча. Але для мяне першай думкай было: няўжо застануся без валасоў? Паверце, адчуванне такой перспектывы амаль што раўназначнае самому дыягназу. Гэтая думка прысутнічае і днём, і ноччу. Ядзе валасы не пачынаюць выпадаць, а ўжо думаеш: што надзець на галаву? — дзеліцца ўспамінамі Валянціна.

Трэба сказаць, што ідэю падказала ўрач у паліклініцы. Яна брала ўдзел у анкалагічнай канферэнцыі ў Польшчы і прывезла адтуль каталог з жаночымі галаўнымі ўборамі для анкахворых. А паколькі наша пацыентка і сама калісьці практыкавала шавецкую справу, вырашыла стварыць такі галаўны ўбор для сябе. Першую шапку пашыла рукамі з ільну.

— Хацелася прыдумаць нешта не зусім стандартнае. Атрымаўся камбінаваны галаўны ўбор — шапка з элементамі хусткі. Бо карыстацца толькі хусткай у маім узросце не вельмі хочацца. Нават у дамашніх умовах, — прызнаецца жанчына.

Жаданне займацца масавым пашывам прыйшло пасля таго, як Валянціна Казукевіч аб'ядналася з іншымі гродзенкамі ў суполку для барацьбы з хваробай. Ідэю падказалі ў аддзяленні анкалогіі Гродзенскай універсітэцкай клінікі і параілі звярнуцца ў сацыяльна-дабрачынны цэнтр «Пара» ў Гродне. Грамадскае таварыства дапамагае анкахворым дзецям.

Жанчына патэлефанавала. Успамінае, што нават не ведала, пра што казаць на той момант, аб чым пытаць і чаго прасіць... Урэшце выказала прапанову — стварыць групу ўзаемадапамогі для хворых дарослых.

— Я сустрэла вельмі шчырае разуменне маёй сітуацыі, — Валянціна зноў вяртаецца ў мінулае. — Прадстаўнік суполкі прапанавала сустрэцца, пазнаёміцца. Адным з праектаў з майго боку якраз і стала ідэя пашыву галаўных убораў. Ну і, вядома, нефармальныя стасункі, сустрэчы, сумесныя мерапрыемствы. Так была створана наша суполка «Разам».

Валянціна адразу вырашыла, што пашыў галаўных убораў не будзе нейкай саматужнай вытворчасцю па-за межамі закона. Яна падрыхтавала неабходныя дакументы, зарэгістравала ІП. Сваю справу адкрыла на ўласныя сродкі. Закупіла абсталяванне. Аказалася, нямала ахвотных дапамагчы. Тым не менш, фармальных момантаў прыйшлося таксама пераадольваць шмат. Цяпер галаўныя ўборы паступаюць у продаж — у асноўным, у крамы медыцынскай тэхнікі.

— Мадэлі таксама можна ўбачыць на маім сайце tina.by, ёсць старонкі ў сацыяльных сетках. Распрацаваны буклеты, якія я распаўсюджваю ў анкааддзяленнях, наладжваю супрацоўніцтва з іншымі рэгіёнамі. Адзін з дзейсных спосабаў апавяшчэння — «сарафаннае радыё». Калі жанчыны бачаць такія шапкі адна на другой, гэта падштурхоўвае іх да пошуку, — расказвае суразмоўніца.

Кожная мадэль захоўвае стылявы почырк аўтаркі. Каб упэўніцца ў тым, што шапка добра пасуе да твару, пробны экземпляр яна абавязкова прымервае на сябе. Спачатку робіць выкрайку, разглядае шмат варыянтаў. Адзін з галоўных крытэрыяў — каб было сучасна і гарманічна.

— Вядома, улічваем узрост нашых патэнцыяльных карыстальніц, — акцэнтуе ўвагу Валянціна. — Зразумела, што ў асноўным гэта людзі больш сталыя. І наўрад ці яны застануцца жаноцкімі, калі надзенуць звычайную спартыўную шапачку. Хустка таксама не кожнай падыходзіць. Да таго ж яны не трымаюцца на галаве. А галаўны ўбор патрэбны і дома, і ў бальніцы, і пры выхадзе на вуліцу. Далёка не кожная жанчына ў такім стане можа выйсці без галаўнога ўбору.

Што датычыцца колеравай гамы, Валянціна больш схіляецца да спакойных, пастэльных тонаў. Хоць ёсць і такія жанчыны, што аддаюць перавагу яркім колерам.

Майстрыха прынесла на сустрэчу некалькі ўласных узораў. Кожная шапачка непаўторная і па форме, і па колеравай гаме. Тканіна — эластычныя трыкатаж з натуральных валокнаў. Гэта баваўна альбо віскоза. Галаўныя ўборы даволі лёгкія і кампактныя — яны не займаюць шмат месца, іх нават можна пакласці ў кішэню. Важна, каб шапкі былі простыя і лёгкія ў карыстанні. Валянціна расказала, што прыносіла свае вырабы ў бальніцу, і жанчыны з задавальненнем прымервалі іх, нават тыя, што ляжалі пад крапельніцамі, маглі надзець яе адной рукой.

Ёсць яшчэ вельмі важная ўмова — галаўны ўбор не павінен несці дыскамфорт. У гэты перыяд, кажа Валянціна, вельмі баліць скура галавы, яна становіцца ўразлівая, адчувае нават лёгкі вецер. Лепш, каб на шапцы не было ніякіх завязак і зашпілек. Летнія варыянты — мінімальна тонкія, лёгкія. Усе яны без падкладкі. У майстрыхі даволі складаная задача — улічваць гэтыя фактары, але зрабіць так, каб шапка не проста шчыльна аблягала галаву. Такая фактура атрымліваецца за кошт невялікіх складак і драпіровак. Некаторыя мадэлі дапоўненыя павязкамі для аб'ёму.

Дарэчы, такія шапкі падыдуць жанчынам не толькі пры страце валасоў, але і тым, у каго яны рэдкія ад прыроды, і наогул многім жанчынам, якія любяць насіць галаўныя ўборы. Некаторыя набываюць іх для таго, каб хадзіць у царкву, бо шалікі не трымаюцца, іх трэба часта папраўляць.

Прыбытак у справе невялікі, можна сказаць, гэта больш сацыяльны праект. Як і ў цэлым дзейнасць гродзенскага аб'яднання «Разам».

— Я заўважыла, што жанчынам, хворым на анкалогію, вельмі важна не адчуваць адзіноту, — дадае суразмоўніца. — Напрыклад, мы ў сваёй групе «Разам» праводзім творчыя сустрэчы. Запрашаем майстрых, яны прыходзяць з задавальненнем. Для многіх нашых удзельніц гэта своеасаблівая псіхатэрапія, да таго ж яны атрымліваюць вынік у выглядзе прадмета для аздаблення інтэр'еру, зробленага сваімі рукамі. Жанчыны сустракаюцца не толькі на майстар-класах, але і проста пагаварыць, падтрымаць адна адну.

Мая суразмоўца згадвае сустрэчы на майстар-класах у анкааддзяленні Гродзенскай універсітэцкай клінікі. Удзельніцы групы разам з валанцёрамі пашылі льняныя сашэткі, купілі ў аптэцы зёлкавых збораў і запрасілі жанчын з палат. Яны самі ўпрыгожвалі сабе сашэткі пацеркамі, вышыўкай, стужкамі, напоўнілі лекавымі травамі. Кожная жанчына атрымала такі падарунак. Некаторыя расказалі потым, што менавіта гэтая сустрэча аказала значны ўплыў, падтрымала іх.

Ва ўмовах пандэміі такія паходы на паўзе, але група трымае сувязь з анкапсіхолагам, жанчынам перадаюць розныя рэчы. Напрыклад, вельмі добры попыт маюць маляванкі-антыстрэс, алоўкі і фламастары. Запатрабаваныя ніткі для вязання, кнігі. Удзельніцы групы афармілі памяткі для хворых і іх родных.

— Мы чамусьці вельмі закрытыя на тэму анказахворванняў. Часцей чуем аб гэтым, калі чалавек памірае. А пра людзей, якія прайшлі праз хваробу і працягваюць жыць, мала хто кажа. І калі мы прыходзім у анкалогію і кажам, што з гэтым сутыкнуліся, і вось, жывём, у людзей з'яўляецца надзея. Аказваецца, гэта яшчэ не канец, — дзеліцца Валянціна.

Яна лічыць, што падтрымаць хворых лепш за іншых могуць толькі тыя, хто сам атрымаў такі дыягназ і мае вопыт барацьбы з анкалогіяй. Але гэта трэба рабіць на прафесійным узроўні, быць падрыхтаваным. Напрыклад, адпаведная дзяржаўная праграма «Роўны кансультант» працуе ў Расіі. Праект нескладаны, ён цалкам распісаны, расказала Валянціна, толькі бяры і карыстайся. Але статус такога кансультанта павінен быць узаконены. У тым, што такая работа запатрабаваная, Валянціна ўжо ўпэўнілася. Бо, пачуўшы дыягназ, чалавек нібы трапляе ў іншы свет, у яго ўзнікае шмат пытанняў. І важна пачуць парады ад тых, хто прайшоў праз нешта падобнае.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Продавец**: открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы», 210034, Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-49507 площадью 116,5 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное здание и магазин, назначение – здание многофункциональное. Капитальное строение с инв. № 200/С-49508 площадью 31,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – проходная, назначение – здание неустановленного назначения.

Капитальное строение с инв. № 200/С-49509 площадью 91,1 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: тамбур. Капитальное строение с инв. № 200/С-49510 площадью 116,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – гараж и бытовка, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Капитальное строение с инв. № 200/С-49511 площадью 280,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка. Капитальное строение с инв. № 200/С-49512 площадью 2120,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – материальный склад № 1, 4, 6, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, навес, отдельная рампа, рампа. Капитальное строение с инв. № 200/С-49513 площадью 1131,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад № 2, 3, 5, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, рампа, навес. Обременение: договора аренды № 1/2016 от 01.01.2016 сроком по 31.12.2023, № 1/2015 от 02.02.2015 сроком по 31.12.2023. Капитальное строение с инв. № 200/С-59958 протяженностью 389,30 м. по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Капитальное строение с инв. № 200/С-106672 площадью 6470,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение, трое ворот, бетонная площадка, три калитки, подпорная стена. Вышеуказанные объекты находятся на зем.участке с кадастровым № 240100000003000082 площадью 1,4611 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания универсальной оптовой базы (право постоянного пользования). Капитальное строение с инв. № 200/С-59954 протяженностью 35,80 м. по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – хозбытовая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Капитальное строение с инв. № 200/С-59955 протяженностью 426,45 м. по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – электрическая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Капитальное строение с инв. № 200/С-59956 протяженностью 57,85 м. по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – водопроводная сеть, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Капитальное строение с инв. № 200/С-59957 протяженностью 70,75 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. **Нач. цена: 585 480,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 58 548,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения повторного аукциона**: **25.08.2021 в 15.00 по адресу**: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**.** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 04.08.2021 с 8.30 по 24.08.2021 до 17.30. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.**

**Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 12.06.2021.** **Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета аукциона после согласования сделки и договора купли-продажи с ОАО «Белресурсы» – управляющей компанией холдинга «Белресурсы», но не позднее 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплата расходов по гос. регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на недвижимое имущество осуществляется за счет Покупателя. *Затраты по подготовке документации по лоту № 1 (проведение независимой оценки) составляют 2156,00 бел. руб. без НДС.* **Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр.лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информацию по торгам можно получить по тел: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 555 41 07 Селезнёв Василий Николаевич.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «АСБ-Агро Кухтичи»**
**(Продавец)**

**ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ КЛУБА,**

**623/С-59614, 214,9 кв. м, Минская обл., Узденский р-н, Неманский с/с, д. Ракошичи, ул. Садовая, 1.**

**Начальная цена** с НДС – 7872,00 руб. **Задаток** – 3000,00 руб. Земельный участок 625682108701000175, 0,1516 га. Право аренды по 09.09.2074. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 17.08.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **13.08.2021** в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182